# Кітайская пляцоўка для літаратурнай дружбы

Доктар філалагічных навук спадарыня Чжан Хуэйцінь, якая працуе ў другім Пекінскім дзяржаўным універсітэце замежных моў, адзначана падзякай міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Ведамасная ўзнагарода — падсумоўванне таго плёну, які складваецца ў аўтарытэтнай кітайскай ВНУ ў справе развіцця беларуска-кітайскіх літаратурных, асветніцкіх стасункаў. Ва ўніверсітэце працуе Цэнтр культуры Беларусі. За некалькі апошніх гадоў склалася неблагая бібліятэка сучаснай беларускай літаратуры. У фарміраванні яе прымаў удзел і Саюз пісьменнікаў Беларусі. Студэнты-лінгвісты выканалі і працягваюць выконваюць даследаванні, звязаныя з гісторыяй Беларусі і беларускай літаратурай. Выкладчыкі і студэнты робяць спробы перакладаць беларускую паэзію з мовы арыгінала на кітайскую мову. Спадарыня Чжан Хуэйцінь уваходзіць у склад міжнароднага рэдакцыйнага савета серыі «Светлыя знакі: паэты Кітая», якая зараз выходзіць у мінскім выдавецтве «Мастацкая літаратура». У прыватнасці, з падказкі Чжан Хуэйцінь выйшаў зборнік вершаў Су Шы на беларускай і кітайскай мовах.

Узнагароду кітайскаму лінгвісту, літаратуразнаўцу ўручылі падчас правядзення чарговай Пекінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу, на якой, дарэчы, прысутнічала прадстаўнічая беларуская дэлегацыя на чале з намеснікам міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Ігарам Бузоўскім.

**Сяргей ШЫЧКО**